**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за чэрвень 2016 г.

## <u>Мерапрыемствы да Году культуры</u>

***10 чэрвеня***

Дзень прафесійных зносін «Год культуры: вывучаем, прапануем, укараняем», удзельнікамі якога сталі супрацоўнікі публічных бібліятэк раёна.

Спецыялісты цэнтральнай бібліятэкі пазнаёмілі сельскіх калег з лакальна-нарматыўнымі дакументамі, з сучаснымі патрабаваннямі да бібліятэчнай статыстыкі, прапанавалі шляхі павышэння наведвальнасці бібліятэк, паказалі правілы сістэматызацыі краязнаўчых матэрыялаў пры стварэнні паўнатэкставых электронных баз дадзеных. Прысутныя падзяліліся сваімі планамі па правядзенні мерапрыемстваў у рамках Года культуры.

ЦБ, 62 чал.

***13 чэрвеня***

«Беларускай байкі ўладары» – пад такой назвай прайшло Свята беларускай байкі і гумару. У ходзе мерапрыемства прысутныя пазнаёміліся з гісторыяй узнікнення і развіцця байкі, з біяграфіяй і творчым шляхам беларускіх аўтараў, малі магчымасць прачытаць свае любімыя гумарыстычныя творы. Увазе гледачоў прадстаўлена відэапрэзентацыя «Беларускай байкі ўладары, ці смяяцца дазваляецца!» Завяршылася мерапрыемства песняй «Сэрца Беларусі» у выкананні Ірыны Асіпук.

ЦБ, 56

***15 чэрвеня***

Падведзены вынікі раённага фотаконкурсу «Сямейны партрэт у кніжным інтэр'еры», які праходзіў ў рамках рэспубліканскай акцыі «Сямейнае чытанне» сярод публічных бібліятэк Кобрыншчыны. На конкурс пададзена 40 фатаграфій, лепшыя з якіх прадстаўлены ў фармаце відэапрэзентацыі на сайце krcls.by.

ЦБ

***24 чэрвеня***

Літаратурнае свята «Певец людских тревог и надежд», прысвечанае 120-годдзю з дня нараджэння паэта-земляка Уладзіміра Кітаеўскага. На свяце прысутнічалі паэт Лявон Валасюк і ўнучка Кітаеўскага Аліна Мідушэўская. Парадавалі жыхароў вёскі сваімі песнямі госці з Брэста - ансамбль народнай песні «Галасы Палесся», з Кобрына - ансамбль «Перазвоны» і фальклорны ансамбль Тэвельскага клуба «Скарыначка». У дар бібліятэка атрымала кнігі паэта.

Тэвельская ПБ, 60 чал.

**Мерапрыемствы ў рамках праграмы летняга чытання «Летом с книгой я дружу»**

***2 чэрвеня***

Адкрыццё серыі мерапрыемстваў «Летние чтения – золотые приключения». На свяце «Не спешите прощаться с детством!» адбылося ўшанаванне самых актыўных чытачоў. Дзеці ўдзельнічалі у разнастайных конкурсах, вясёлых віктарынах. Арганізавана акцыя «Дзіцячыя далоні за мір ва ўсім свеце», конкурс малюнкаў на асфальце «Лета залатое». Яркай падзеяй свята стаў флэшмоб «Мы любим Беларусь!».

Батчынская ПБ, 90 чал.

***2 чэрвеня***

Свята «Страна с названием детство». Дзеці пазнаёміліся з цікавай бібліятэчнай выставай «Дорогами добра», паўдзельнічалі ў вясёлай конкурснай праграме, адказалі на пытанні віктарыны, пасмяяліся над Клоунам і Вракай-забіякай. Лялечны кружок «Экотеремок» паказаў дзецям цікавы спектакль. У праграме прагучалі музычныя нумары ў выкананні дзіцячага калектыву ЦКД. Бібліятэка аб’явіла пра адкрыццё конкурсу «Мы читаем летом!», першы этап якога завершыцца пад канец чэрвеня.

Дзівінская ПБ, 80

***2, 3 чэрвеня***

Свята для дзяцей «Летнее настроение с книгой» прайшло пазнавальна і весела. Дзеці школьнага лагера гімназіі паглядзелі лялечны спектакль «Слагаемые здоровья», а летні лагер дзіцячага садка № 4 - лялечны спектакль «Жадная ежиха». Хлопчыкі і дзяўчынкі з задавальненнем прымалі ўдзел у забаўляльных конкурсах, адказвалі на пытанні віктарыны, за што атрымалі прызы.

ДБ, 110 чал.

***6 чэрвеня***

Дзень вясёлых задум «Как прекрасен летний день». Дзеці адгадвалі загадкі, адказвалі на пытанні віктарыны «Про всё и всех». З задавальненнем узялі ўдзел у квэст-гульні «Остров сокровищ», дзе ім давялося прайсці розныя выпрабаванні, каб знайсці куфар са скарбамі.

Лелікаўская ПБ, 19 чал.

***7 – 23 чэрвеня***

У конкурсна - гульнёвай праграме «Читай, играя. Отдыхай, твори!» прынялі ўдзел вучні лагераў школ горада і летні лагер дзіцячых садкоў. Паглядзелі лялечныя спектаклі: «Жадная ежиха», «Слагаемые здоровья», актыўна прымалі ўдзел у віктарынах, гульнях, конкурсах, чыталі вершы, спявалі песні і танцавалі.

ДБ, 383 чал.

***13 чэрвеня***

Гульнёвае асарці «Кніжнымі сцяжынкамі чытальнага лета». На сустрэчу да дзяцей прыйшлі Карлсан, доктар Айбаліт, цётачка Непагодка, Лета і паштар Печкін. Дзеці з задавальненнем прынялі ўдзел у літаратурных гульнях, віктарынах, конкурсах, пазнаёміліся з кніжнай выставай «Казкі

разам сабраліся». Маленькія наведвальнікі панеслі з сабой дадому цікавыя кнігі і салодкія прызы.

Лукская ПБ, 25 чал.

**Іншыя мерапрыемствы**

***9 чэрвеня***

Вечар сустрэчы з чытачамі з цыклу «Сувязь пакаленняў». Увазе сталых і дзяцей пададзены майстар-клас па пляценні з газетных трубачак. Прадстаўнік Кобрынскага ТЦСОН паказала, якія цудоўныя рэчы можна рабіць уласнымі рукамі з даступных матэрыялаў, скарыстаючы толькі спіцы і клей, якія знойдуцца ў кожнай хаце.

Дзівінская ПБ, 27 чал.

***20 чэрвеня***

У інфармацыйна–сэрвісным цэнтры цэнтральнай раённай бібліятэкі адбыўся чацвёрты штогадовы турнір па інтэлектуальных гульнях «Кобры собирают друзей». Турнір сабраў 6 каманд з Брэста, 2 каманды з Кобрына і каманду з Маларыты.

У рамках спаборніцтва адбыліся 2 гульні «Своя игра» і «Что? Где? Когда?» Пытанні да турніру напісалі члены каманды «Кобры»: Юрый Хмялёўскі, Багдан Купак і Вячаслаў Кузьміч.

ЦБ, 60

***26 чэрвеня***

У Дзень молодзі Кобрынская цэнтральная бібліятэка правяла квэст-гульню "Родны горад – 2016". На кожнай станцыі хлопцаў і дзяўчат чакалі цікавыя заданні, з якімі яны з лёгкасцю справіліся.

ЦБ, 32 чал.

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 2 36 81